View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 81–25

# ПРЫЁМ ТРАНСФАРМАЦЫІ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ ТЭКСТУ

**Місюкавец Любовь Петровна, Палескі дзяржаўны ўніверсітэт**
Misiukavets Liubou, mlp–1963@tut.by

**Анатацыя.** Эквівалентны пераклад ажыццяўляецца на ўзроўні, патрэбным і дастатковым для перадачы нязменнага плана зместу пры захаванні адпаведнага плана выказвання. Падчас перакладу часта здараецца немагчымым выкарыстанне адпаведных слоў і выразаў, якія нам дае слоўнік. У падобных выпадках перакладчык звяртаецца да трансфармацыйнага перакладу.

**Ключавыя словы:** пераклад, граматычныя трансфармацыі, лексічныя трансфармацыі, лексіка–граматычныя трансфармацыі.

Палесду

Для фарміравання гарманічна развітай асобы неабходны высокая культура, высокія маральныя прынцыпы і шырокі спектр агульнаадукацыйных ведаў. Усе гэтыя праблемы паспяхова вырашаюцца праз сістэму гуманітарызацыі эканамічнай адукацыі. Таму ў навучальных планах побач са спецыяльнымі дысцыплінамі стаіць і родная мова. Сістэматычная праца над перакладам тэкстаў навуковага стылю з рускай мовы на беларускую дае добрыя вынікі ў навучанні і выхаванні студэнтаў.

З пункту гледжання тэорыі міжкультурнай камунікацыі, пры перакладзе супастаўляюцца не толькі дзве мовы, але і дзве культуры ў шырокім разуменні гэтага слова. Таму задача перакладу ўключае не толькі адшуканне эквівалентных адпаведнасцяў для перадачы камунікатыўнай усталёўкі адпраўніка, але і падаванне атрымальніку неабход-

ных для разумення тлумачэнняў, так каб рэакцыя іншамоўнага атрымальніка адпавядала б рэакцыі атрымальніка паведамлення на зыходнай мове [3; с.26].

У наш час існуе мноства падыходаў да падзелу перакладніцкіх трансфармацый на віды і тыпы, і мноства класіфікацый, прапанаваных рознымі аўтарамі. Больш часта вылучаюць два віды прыёму перакладу: падстаноўкі і трансфармацыі.

Прыёмы перакладу, якія заснаваны на максімальна магчымым сэнсава–структурным паралелізме мовы арыгінала і мовы перакладу, называюць падстаноўкамі. З падстаноўкамі мы маем справу, калі перакладаем слова ў слова, радок у радок, толькі падстаўляючы замест слоў і спалучэнняў адной мовы словы і спалучэнні другой мовы.

Прыёмы перакладу, якія выкарыстоўваюць адыход ад магчымага сэнсава–структурнага паралелізму тэксту арыгінала і перакладу, называюць трансфармацыямі. Трансфармацыя – аснова большасці прыёмаў перакладу. Заключаецца ў змене фармальных (лексічныя ці граматычныя трансфармацыі) ці семантычных (семантычныя трансфармацыі) кампанентаў зыходнага тэксту пры захаванні інфармацыі, прызначанай для перадачы [2; с.167].

Вышэйназваныя прыёмы перакладу грунтуюцца на наяўнасці (або адсутнасці) у абедзвюх мовах так званых моўных паралеляў. Агульнасць паходжання ўсходнеславянскіх моў, блізкасць іх гістарычнага развіцця і ўзаемадзеянне на сучасным этапе абумовілі наяўнасць у беларускай і рускай мовах аднолькавых ці блізкіх слоў, словазлучэнняў, зваротаў.

Дасягненне перакладчыцкай эквівалентнасці, нягледзячы на разыходжанні ў фармальных і семантычных сістэмах дзвюх моў, патрабуе ад перакладчыка перш за ўсё ўменне зрабіць шматлікія і якасна разнастайныя міжмоўныя пераўтварэнні – так званыя трансфармацыі – для таго, каб тэкст перакладу з максімальна магчымай дакладнасцю перадаваў усю інфармацыю, якая заключана ў зыходным тэксце [1, с. 22].

Традыцыйна трансфармацыі дзеляцца на граматычныя, лексічныя і лексіка–граматычныя.

Пры граматычных трансфармацыях пераўтвараецца фармальная структура выказвання і застаецца нязменным набор слоў, які складае яго сэнс. Асноўнай прычынай такога тыпу трансфармацый з’яўляецца неаднолькавасць структур зыходнай мовы і мовы перакладу, што праяўляецца ў адсутнасці пэўных форм і канструкцый у адной з моў (ці ў мове арыгінала, ці ў мове перакладу). Звернем увагу на асноўныя разыходжанні ў мовах. Напрыклад, пры перакладзе з рускай мовы на беларускую ёсць несупадзенне назоўнікаў ў *родзе, ліку, склоне* (рус. *Заем, прибыль, риск* ( м. р.) бел. *Пазыка, прыбытак, рызыка*(ж.р.); рус. *Поведение, крупа* (толькі адз. Л. ) – бел. *Паводзіны, крупы*(толькі мн.л.); рус. *Задержка за деньгами* – бел. *Затрымка ў грашах* . У адрозненне ад рускай мовы назоўнікі 2–га скланення ў форме роднага склону адзіночнага ліку ў беларускай мове могуць мець канчаткі –а(–я), і –у, (–ю) у залежнасці ад лексічнага значэння: *кредита – крэдыту, рынка – рынку, расчета – разліку.* Пры перакладзе важна памятаць і пра канчаткі назоўнікаў адзіночнага ліку першага і другога скланенняў меснага склону, якія маюць канчаткі –е, –і, –ы, –э, –у: *экономике– эканоміцы, руке–руцэ, в банке– у банку.*

Прыметнікі і прыслоўі ў форме вышэйшай ступені параўнання патрабуюць злежнага слова ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *за: удобный – зручнейшы за, ближе–бліжэй за.*

У рускай мове актыўна ўжываюцца ўсе формы дзеепрыметнікаў, што не характэрна для беларускай мовы. Так сустракаюцца толькі ў тэрмінах дзеепрыметнікі залежнага стану цяперашняга часу з суфіксамі –уч,–юч,–ач,–яч: *текущий счет – бягучы рахунак, нападающий – нападаючы,* а ў іншых выпадках дзеепрыметнік замяняецца аднакаранёвым назоўнікам (*будущее фирмы – будучыня фірмы),* прыметнікам *(соответствующий налог – адпаведны падатак),* дзеясловам *(студенты, спешившие на занятия – студэнты спяшаліся на заняткі),* перабудоўваецца ў дадзены сказ (*обслуживающий персонал–персанал, які абслугоўвае*).

У адрозненне ад рускай мовы, у беларускай мове ўтвараюцца дзеепрыслоўі незакончанага трывання ад дзеясловаў *піць – п’ючы, ліць–льючы, пісаць–пішучы.*

У лексічных сістэмах беларускай  і рускай моў назіраюцца несупадзенні, якія выяўляюцца ў тыпе сэнсавай структуры слова. Таму пры перакладзе такіх тэкстаў словы адбіраюцца з асаблівай стараннасцю для максімальна дакладнай перадачы думкі – гэта лексічная трансфармацыя [2, с.168].

Сярод разнавіднасцей лексічных трансфармацый выдзяляюць наступныя:

а) канкрэтызацыя – замена слова або словазлучэння зыходнай мовы з больш шырокім значэннем словам або словазлучэннем мовы перакладу з больш вузкім значэннем *(был прав–меў рацыю)*;

б) генералізацыя – замена адзінкі зыходнай мовы, што мае больш вузкае значэнне, адзінкай мовы перакладу з больш шырокім значэннем *(У стены стояли стеклянные шкафы. – Паўз сцяну стаялі шкляныя шафы);*

в) кампенсацыя – ужываецца ў тых выпадках, калі пэўныя элементы тэксту арыгінала па той або іншай прычыне не маюць эквівалентаў у мове перакладу і не могуць быць перакладзены яго сродкамі, перакладчык узнаўляе тую ж інфармацыю якімі–небудзь іншымі сродкамі, прычым неабавязкова ў тым жа месцы тэксту, што ў арыгінале *(Общаться–мець зносіны, отчество– імя па бацьку)* [2, с.167].

Лексіка–граматычныя трансфармацыі ахопліваюць пэўнымі зменамі як граматычную будову моўнай адзінкі, так і яе семантычную напоўненасць. Пры перакладзе словазлучэнняў неабходна памятаць пра тое, што ў кожнай мове свае асаблівасці  выражэння граматычнай і сэнсавай сувязі слоў. Таму пераклад свабодных словазлучэнняў не варта разумець як пераклад асобных кампанентаў (*управляющий делами – кіраўнік спраў* (*а не кіраўнік справамі*)).

Такім чынам, перакладчык, які працуе не механічна, зацікаўлены ў пэўным выбары моўных сродкаў. Пераклад – гэта не простае ўзнаўленне ўсёй сукупнасці элементаў арыгінала, а складаны і свядомы пошук разнастайных магчымасцей іх перадачы. Майстэрства перакладу прадугледжвае і ўменне выкарыстаць пэўны тып лексічных або граматычных трансфармацый, ад гэтага ўмення будзе залежаць паўнацэннасць тэксту перакладу.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Кузміч, В.А. Асаблівасці навуковага стылю беларускай мовы ў кантэксце навукова–тэхнічнага перакладу / В.А. Кузьміч, Г.Ф. Швед. Мінск: БДТУ, 2013. С. 20–25.

2. Лапкоўская, А.М. Беларуская мова (прафесійная лексіка): вучэб. дапаможнік для студ. / А.М. Лапкоўская.– Гродна : ГрДУ, 2009. – 271 с.

3. Латышев, Л.К. Курс перевода: Эквивалентность перевода и способы ее достижения / Л.К. Латышев.– М.: Международные отношения, 1981. – 248 с.


Полесгу